ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЕЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ДЭКАДНІК



СЭКТАРУ КНІГАГАНДЛЮ ДзВБ

№ 4-5 (11) | РАССЫЛАЕЦЦА ПА ЎСЕЙ СЕЦІ КНІГАГАНДЛЮ ПА РАЗЬВЁРСТЦЫ | АДРАС РЭДАКЦЫІ Менск, Пляц Волі 5, тэл. № 7—41 | 20 лютага 1932 г.

ЗА ПАДВЫШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ КНІГАЙ 3-ГА БАЛЬШАВІЦКАГА ВЯСЕНЬНЯГА СЕВА

За масавую баявую навукова-папулярную сельска-гаспадарчую кнігу

У пасьпяховым вырашэньні пастаўленых партыяй і ўрадам задач, якія паказаны ў пастанове „Аб правядзеньні веснавое сельскагаспадарчае кампаніі" (Зьвязда ад 10/I-1932 году) наш друк—газэта, часопісь, кніга—набывае вялікае значэньне. Ён мобілізуе, організоўвае шырокія рабочыя, колгасныя і бядняцка серадняцкія масы навакол чарговых задач, зьвязаных з чарговым правядзеньнем 4-га апошняга году пяцігодкі, з пасьпяховым правядзеньнем 3-е бальшавіцкае вясны.

Перад Дзяржаўным Выдавецтвам Беларусі стаіць надзвычай адказная задача: даць добрае якасьці масавую політычна-баявую кнігу па ўсіх галінах нашага соцыялістычнага будаўніцтва, па ўсіх галінах соцыялістычнага земляробства. Сельскагаспадарчаму сэктару трэба забясьпечыць літаратураю па пытаньнях цэнтральных задач колгаснага будаўніцтва: організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў і асноўнага зьвяна колгаснага будаўніцтва—колгасная брыгада.

Каб выканаць гэту цэнтральную задачу плянам сельска-гаспадарчага сэктару на 1932 год і да кампаніі веснавой сяўбы гэтага году схэматычна вызначана такая тэматыка: правільная організацыя працы; зьдзельшчына; колгасная брыгада; агротэхніка; зооовэт-тэхніка; аўладаньне тэхнікаю буйное соцыялістычнае гаспадаркі; павялічэньне продукцыйнасьці і ўраджайнасьці; таварнасьць; сваячасовая здача продуктаў дзяржаве (таварныя лішкі), паводле вызначаных плянаў; падрыхтоўка кадраў масавае кваліфікацыі (брыгадзіраў, трактарыстаў, масенаводаў, жывёлаводаў, сьвінаводаў, птушкаводаў, вэтсанітараў, доек, пастухоў, канюхоў і г. д.) сярэдняе і вышэйшае кваліфікацыі; падрыхтоўка кадраў сельскагаспадарчае вытворчасьці; разгортваньне соцыялістычнае жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі; птушніцтва; канегадоўлі; работа колгасных таварных фэрм—МТФ, СТФ, КТФ, ПТФ і г. д.; практыка саўгаснага і колгаснага будаўніцтва лепшыя гаспадаркі соцыялістычнага і пасьлядоўна-соцыялістычнага тыпу (колгасы, саўгасы і МТС); правільнае і сваечасовае разьмеркаваньне прыбыткаў і ўраджаю ў колгасах; правільны ўлік працы, падручнікі для с.-г. саўгасвучаў, тэхнікумаў і ВНУ.

Адна з важнейшых задач—сваечасовы выхад з друку кнігі і сваечасовая яе адгрузка, прасоўваньне ня толькі ў раёны, але і да кожнага саўгасу, колгасу, да кожнай МТС, да кожнае навучальнае ўстановы (саўгасвучы, ШКМ, сямігодкі, тэхнікумы, ВНУ), да кожнае вёскі, кожнага паселішча.

Мы яшчэ не навучыліся гандляваць кнігаю, як гэта патрэбна: слаба разьбіраюцца работнікі кніжнага прылаўку з тэматыкаю літаратуры, з яе кароткім зьместам, характарам і г. д. (анотацыя).

„Дэкаднік" і часопісь „Кніга масам", што выдаюцца ДзВБ, павінны быць настольнымі дапаможнікамі ў штодзённай працы работнікаў кнігі. Іх трэба ня толькі чытаць, але і мець у іх самы актыўны ўдзел—абменьвацца практыкаю лепшых і горшых кнігарняў, практыкаю ўдарнікаў кнігі пра мэтады і спосабы прасоўваньня, пра гандаль кнігаю. У гэтых выданьнях патрэбна даваць месца водгукам чытачоў, рэцэнзыям і бібліографіі ўсіх толькі што надрукованых кніг.

Мы павінны дамагчыся такога становішча, каб кніга не затаварвалася ня толькі на базе Сэктару Кнігагандлю ДзВБ і БАКт'у але і на паліцах раённых кнігарняў. Папярэднія соцыялістычныя плянавыя заказы з улікам культурнага росту і попыту колгасных мас, рабочых саўгасаў і МТС нам патрэбны, а не опортуністычныя лічбы „са столі"—тады мы даб'ёмся таго, што папера ня будзе марнавацца, не давядзецца накіроўваць назад цэлыя тоны паперы замакулатураных кніг. Гэта трэба помніць ўсім работнікам кнігі. Заказы павінны выконвацца сваечасова.

Раённым організацыям трэба праверыць, як прасоўваецца кніга кожнаю раённаю кнігарняю, як ідзе савецкі гандаль кнігаю як папаўняюцца бібліотэкі, школы, саўгасвучы, МТС, колгасы, навучальныя установы. Загадчыкам, у сваю чаргу, трэба зьвярнуцца па дапамогу да Праўленьняў Райколгассаюзаў, колгасаў, да Загадчыкаў школ, культкамісіі саўгасаў і МТС.

Трэба дамагчыся рэгулярнае справаздачнасьці кнігарняў перад раённымі організацыямі і ўстановамі (АПО, РК, КПбБ, РК КСМ, Інспэктура РВК, Райколгассаюзы)

Трэба наладзіць брыгадам раённых газэт разам з прадстаўнікамі таей установы, дзе будзе стаяць даклад, папярэдні агляд працы па распаўсюджваньню кнігі. Пара ўжо ставіць справаздачы і даклады пра значэньне кнігі, пра яе распаўсюджваньне (гандаль) непасрэдна ў буйных саўгасах, колгасах, МТС і не забывацца на адну з важнейшых задач якая спрыяе палепшаньню якасьці кнігі—пра бібліографію і рэцэнзіі на кнігі, якія выдаюцца, як у цэнтральных газэтах, так і ў раённых. Трэба выконваць дырэктыву партыі па гэтым пытаньні сыстэматычна і сваечасова. Гэта дасьць магчымасьць не выдаваць непатрэбных і шкодных кніг.

Застаюцца лічаныя дні. Іх трэба скарыстаць. Трэба бальшавіцкімі тэмпамі павесьці працу, каб асноўная літаратура да кампаніі веснавое сяўбы была сваячасова на базе. Трэба абвясьціць штурм вузкім мейсцам (стыль, цынкаграфія, друкарня). Нам патрэбна выпушчаць штодзень па чатыры назвы (16-18 друкованых аркушаў). Ніводнага дня спазьненьня. Сваечасова забясьпечым чытача кнігаю да 3-е бальшавіцкае вясны. Сэктару Кнігагандлю ДзВБ і кнігагандлёвым організацыям патрэбна сваечасова давесьці кнігу да колгасьніка, рабочага саўгасу і МТС. Толькі пры такіх умовах пастаўленыя партыяй задачы ў 3-яй бальшавіцкай вясьне будуць выкананы.

Т. Ляўша

РЭКОМЭНДАЦЫЙНЫЯ БІБЛІОТЭЧКІ СЕЛЬСКА-ГАСП. ЛІТАРАТУРЫ ДА 3-е БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЯСНЫ

(ПРАЦЯГ *)

АГРАТЭХНІКА.

(кошт. 4 р. 70 к.)

Асеева. Культура раньняй бульбы, ц. 10 к.

Вільямс. Проблема ўраджайнасьці, ц. 10 к.

Вільямс і Хорцееў. Способы аднаўленьня і падтрыманьня ўрадлівасьці глебы, ц. 5 к.

Герасімаў. Аўладай тэхнікаю колгаснай вытворчасьці, ц. 7 к.

Гудзіліна. Угнаеньне пад канюшыну, ц. 10 к.

Дамінікоўскі. Аграномічныя руды БССР, ц. 40 к.

Дамінікоўскі. Вапнаваньне глебы, ц. 12 к.

Дамінікоўскі. Каліевыя ўгнаеньні, ц. 75 к.

іванюк. Паляпшэньне насеннага матарыялу, ц. 12 к.

Пратасеня. Кіслотнасьць глеб Меншчыны, ц. 1 р. 30 к.

Кляшчэньнікаў. Зялёнае ўгнаеньне, ц. 10 к.

Максімовіч. Як трэба садзіць бульбу, ц. 3 к.

Максімовіч. Выбар сорту і пасадка бульбы ц. 15 к.

Мяцельскі і Старавойтаў. Кіслотнасьць глебы ў сувязі з вапнаваньнем, ц. 45 к.

Маслакавец. Шкодныя зьявы надвор'я і змаганьне з імі, ц. 15 к.

Разумоўская. Бактэрыальнае ўгнаеньне, ц. 25 к.

Савіцкі і Трус. Вапна, як угнаеньне, ц. 25 к,

Уласенка. Мінэральныя ўгнаеньні і карысьць ад іх, ц. 25 к.

МЭЛІОРАЦЫЯ І ТОРФ.

(Кошт....)

Бахцееў. Папаравы клін і тарфяныя угнаеньні, ц. 05 к.

Бахцееў. Ужываньне тарфяных угнаеньняў, ц. 40 к.

Бахцееў. Колгасы, ўжывайце торф на ўгнаеньне, ц. 05 к.

Гнеўка. Як ператварыць балота ў выгадную зямлю, ц. 15 к.

Гнеўка. Плятнёвыя пабудовы ў мэліарацыйнай справе, ц. 15 к.

Кобазаў. Тарфяны подсьціл, ц. 75 к.

Левікаў. Веснавое разводзьдзе і яго значэньне для заліўных сенажацяў, ц. 10 к.

Трус. Тарфяныя ўгнаеньні, ц. 40 к.

МЭХАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

(кошт 5 руб.)

Адстанаў. Памятка разьязднога мэханіка, ц. 30 к.

Адстанаў. Што трэба ведаць трактарысту, які пачынае працаваць на трактары, ц. 25 к.

Апрэсянц. МТС і колгасы, ц. 10 к.

Вэйс. Мэханізацыя культуры бульбы, 50 к.

Гусяцкі. Трактарная счэпка ТС-ЗК конструкцыі акц. т-ва Сельгасснабжэньня, ц. 20 к.

Дрожджын. Машыны ў сельскай гаспадарцы. ц. 20 к.

Жданаў. Сартоўкі. ц. 15 к.

Ерусалімскі. Пескін. Бягучы рамонт трактароў. ц. 55 к.

Казьменка. Догляд за трактар м „Інтэрнацыянал", ц. 55 к.

Сушкоў. Рамонт і захаваньне с. г. машын. ц. 45 к.

Скіба. Организацыя і выкарыстаньне трактарных калён. ц. 25 к.

Маскалёў. Беражэце с. г. машыны. ц. 5 к.

Трактарныя трохлямешныя і чатырохлямешныя плугі. ц. 30 к.

Цьвяткоў. Рамонт с. г. інвэнтару. ц. 15 к.

Шыдлоўскі. Прылады перадпасеўнай апрацоўкі. ц. 70 к.

Юдзін. Правілы догляду с. г. машыны. ц. 30 к.

БАРАЦЬБА СА ШКОДНІКАМІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

(Кошт....)

Васільеў. Барацьба са шкоднікамі і хваробамі с-г расьлін. ц. 95 к.

Вядзеце вясною барацьбу са шкоднікамі садоў, ц. 1/2 кап.

Галахаў. Шкоднікі лёну і змаганьне з імі ц.

Дарожкін. Галаўня с/г расьлін. ц. 10 к.

Дарожкін. Хваробы збожжа, ц. 90 к.

Маркавецец. Хатнія паразыты, грызуны, барацьба з імі, ц. 10 к.

Павялічым ураджай гародніны шляхам зьнішчэньня шкоднікаў. (лістоўка) ц. 1/2 к.

Пратручваньне насеньня—барацьба з сажаю, барацьба зз высокі ўраджай, (лістоўка) ц. 1/2 кап.

Пілько. Лугавы матыль, ц. 10 к.

Пілько. Капусная муха, ц. 5 к.

Пілько. Барацьба са шкоднікамі, ц. 10 к.

Плавільшчыкаў. Як мы змагаліся з пладажэркаю, 10 к.

Старобіна. Палявы смоўж і барацьба з ім, ц. 4 к.

ВЭТЭРЫНАРЫЯ

(кошт 1р. 60 к...)

Аляксандраў. Першая дапамога буйнай рагатай жывёле ў няшчасных выпадках. Пры раптоўных захворваньнях і пры родах, ц. 12 к.

Аляксандраў. Першая дапамога ў няшчасных выпадках і раптоўных хваробах коняй, ц. 12 к.

Аляксандраў. Шаленства ў жывёлы і чалавека і змаганьне з ім, ц. 15 к.

Аляксандраў. Сап у жывёлы і чалавека і змаганьне з ім, ц. 15 к.

Беліцэр. Сухоты свойскае жывёлы, ц. 08 к.

Беліцэр. Клешчавыя ліхарадкі хатняе жывёлы, ц. 18 к.

Ліўшыц. Тубэркулёз у хатняй жывёлы, ц. 45 к,

Ліўшыц. Хвароба сьвіней, ц. 15 к.

Макарэўскі. Сухоты свойскае жывёлы, ц. 10 к.

Скамарохаў. Пільнуйце жывёлу ад заразы, ц. 07 к,

Скамарохаў. Кастрацыя жывёлы, ц. 05 к.

Ціон. Што трэба ведаць сьвінару пра вэтэрынарыю, ц. 15 к.

* Пачатак глядзі дэкаднік № 3 (9)

ПРАЗ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІЯ ЧАСТКІ ШЛЯХАМ САДРУЖАСТВА— ДАЦЬ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧУЮ КНІГУ САЎГАСАМ, КАЛГАСАМ І МТС

Пасьпяховае правядзеньне 3-е бальшавіцкае сяўбы і выкананьне ўсіх тых вялізарных задач, што пастаўлены партыяй і ўрадам, патрабуе ад кнігагандлёвых організацый цалкам і кожнага работніка паасобку аддаць максымум увагі і ініцыятывы на тое, каб сельска-гаспадарчаю, колгаснаю навукова-тэхнічную і агітацыйна-політычнаю кнігаю забясьпечыць кожнага калгасьніка, саўгасьніка, работніка МТС і аднаасобніка, каб зрабіць кнігу маёмасьцю шырокіх працоўных колаў вёскі.

Вялікія посьпехі распаўсюджваньня пералічаных вышэй кніг у леташнім годзе сярод чырвонаармейцаў і компалітскладу вайсковых частак Беларусі гаворыць за тое, што гэтым, сапраўды масавым, мэтодам трэба працаваць з кнігаю і праводзячы 3-ю бальшавіцкую сяўбу 4-га заключнага году пяцігодкі.

Загадчыкам раённых кнігагандлёвых адзінак (ДзВБ, БАКТ'у і ОГІЗ'у трэба зараз-жа дагаварыцца з вайсковымі часткамі аб удзеле чырвонаармейцаў у распаўсюджваньні кнігі.

Трэба зладжыць і распаўсюдзіць праз чырвонаармейцаў і компалітсклад спэцыяльныя танныя бібліятэчкі. Іх, у парадку садружаства і шэфства, чырвонаармейцы і компалітсклад павінны распаўсюдзіць сярод колгасьнікаў, рабочых саўгасаў, МТС і на прадпрыемствах. Акрамя танных бібліятэчак, трэба будзе разам з прадстаўнікамі вайсковых частак і аграномамі зладзіць больш грунтоўныя бібліятэчкі, пристасаваўшы іх да мясцовых умоў і да гаспадарчага профілю раёнаў і асобных колгасаў, саўгасаў, МТС.

Ў час правядзеньня гэтае кампаніі патрэбна будзе зрабіць выстаўкі сельскагаспадарчае, колгаснае, агротэхнічнае і масава-політычнае літаратуры ў буйных саўгасах, колгасах, і МТС. Вялікую дапамогу могуць зрабіць брыгады кнігаяошаў ад вайсковых частак для распаўсюджваньня літаратуры сярод рабочых на прадпрыемствах, і брыгады рабочых для распаўсюджваньня літаратуры сярод вайсковых частак. Такія брыгады патрэбна стварыць зараз-жа.

Кнігагандлёвым організацыям неабходна правесьці конкурс на лепшую пастаноўку работы па распаўсюджваньню кнігі да 3-е бальшавіцкае сяўбы сярод вайсковых частак і на прадпрыемствах. Ён павінен даць такія паказьнікі: лепшае абслугоўваньне непасрэдна чырвонаармейцаў сваей часткі, распаўсюджваньнем сярод іх бібліотэчак; павялічэньне процантаў рабочых і служачых фабрык, заводаў і ўстаноў, якія ў парадку шэфства і садружаства былі ахоплены бібліотэчкамі; лепшае абслугоўваньне вайсковых частак, саўгасаў, колгасаў і МТС выстаўкамі літаратуры, лепшае разгортваньне масавых формаў работы з кнігаю (кнігаяошаства, выезды брыгад у саўгасы, колгасы і МТС, популярызацыя сельска-гасп. колгаснай і агротэхнічнай кнігі).

Кампанія павінна прайсьці шляхам разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва, шляхам соцумоў паміж вайсковымі часткамі і рабочымі прадпрыемстваў.

Апэратыўная інфармацыя

ВЫШЛІ З ДРУКУ ЗА СТУДЗЕНЬ

ПАРТМАСПАЛІТСЭКТАР

Шэйман М.— Агнём і крывёю ў імя бога. 6,5 арк., т. 5.000 ц. 60 к.

Кніжка напісана популярна. Без яе нельга абысьціся ў нашай пропагандыцкай антырэлігійнай працы.

Чарвякоў В. доктар.— Слуцкія муміі. 5 арк. т. 3.000, ц. 80 к.

Грунтуючыся на строга-навуковых досьледах, падаюцца вынікі ўскрыцьця і дасьледваньня машчэй „вядома младзенца Гаўрыіла Слуцкага і княгіні Софіі", даступная шырокім колам чытачоў.

Пятухоў М.— За ўсеагульнае тэхнічнае навучаньне ўдарнікаў. 2 ар. т. 5.000, ц. 10 к.

Завочны Комуністычны Унівэрсытэт. Гісторыя міжнароднага рэв. руху № 1. 5,5 арк, т. 3.000, ц. 50 к.

Жданаў М.— Японскі імпэрыялізм у Манчжурыі (з прадмоваю генэральнага сакратара Профінтэрну А. Лазоўскага) ст. 80 т. 5000, ц. 20 к.

Паўчынскі Э.— Грамадзкае харчаваньне на службе індустрыялізацыі. ст. 176. т. 5000, ц. 75 к.

Палітычная экономія.— Часопісь-падручнік для завочнікаў саўпартшкол і камсамольскіх унівэрсытэтаў, вып. 1-ы. ст. 44. т. 3000, ц. 40 к.

Каменшчыкаў Проф.— Праўда пра неба. (антырэлігійная гутарка пра сьветабудову) ст. 160. т. 3.000, ц. 80к.

Кніжка напісана надзвычай популярна.

Молатаў.— Кастрычніцкая рэволюцыя і барацьба за соцыялізм (Даклад на ўрачыстым сходзе Маскоўскага Савету прысьвечаны XIV-й гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі 6-га лістапада) ст. 32 т. 7 000, ц. 10 к.

Кіселеў Д-р.— Рэлігія і савецкая мэдыцына. ст 52. т. 3.000, ц. 15 к.

Вельмі каштоўная для антырэлігійнае пропаганды.

ЦКК-РСІ.— У барацьбе за індустрыялізацыю БССР, за 6 умоў тав Сталіна. ст. 80, т. 5.000, ц. 25 к.

ТЭХНІЧНЫЯ КУЛЬТУРЫ.

(кошт 1 р. 90 к.)

За пашырэньне плошчы і ўздым ураджайнасьці лёну і канапель, ц. 10 к.

Лапавок Каноплі, ц. 40 к.

Медзіш. Хваробы лёну і канапель, ц. 15 к.

Тарасаў. Лён, ц. 25 к.

Шатэрнік. Культура лёну, ц. 50 к.

Рэнард. Сэлекцыя культуры лёну ў БССР. ц. 10 к.

Лён і каноплі. (Зборнік). ц. 30 к.

Як організаваць працу ў ільнаводных колгасах, ц. 12 к.

ГАРОДНА-САДОВАЯ ГАСПАДАРКА.

(кошт. 3 р. 15 к.)

Балцін. Ягадны сад. ц. 05 к.

Каваль. Закладка колгаснага саду. ц. 35 к.

Красачкін. Цыбуля і часнок. ц. 70 к.

Крэйдзік. Стандартныя гатункі пладовых дрэў. ц. 45 к.

Камарова і Іванова. Колектыўны пладовы гадавальнік. ц. 25 к.

Карасьцелаў. Забясьпечым краіну гароднінаю. ц. 12 к.

Лявіцкая. Маліна. ц. 10 к.

Хабенка. Садоўніцтва і гародніцтва. ц. 10 к,

Хаеў. Раньняе вырошчваньне гародніны і расада. Ц. 22 к.

Цярохін. Пладовы гадавальнік. ц. 10 к.

Чэмелаў. Гадоўля цыбулі, ц. 15 к.

Чэмелеў. Гадоўля капусты ў полі, ц. 25 к.

Шорах. Гародныя культуры на балоце, ц. 25

СЕЛЬГАССЭКТАР

Левікаў М. Л.—Веснавое разводзьдзе і яго значэньне для заліўных сенажацяў. 2,5 арк. т. 5.000, ц. 10 к.

Чэмелеў В.— Харчовыя грыбы і х выкарыстоўваньне. $3\frac{1}{4}$ арк., т. 2 00, ц. 50 к.

Чэмелеў В.— Як разводзіць насеньне кармавых караньплодаў. Выд. папоўненае. $3\frac{1}{4}$ арк., т 12.000, ц. 25 к.

Юдзін А. — Правілы догляду сельскагаспадарчых машын. $3\frac{1}{4}$ арк., т. 10.000, ц. 30 к.

Знаёміць з новымі машынамі. Разьдзелы: установка плугоў, трактарныя плугі, пільцівізатары, буккер, падрыхтоўка поля, сартаваньне ільну і г. д. Напісана ясна і популярна. Разьлічана на шырокія масы колгасьнікаў і колгасныя кадры.

Сяргееў М.— Малако, догляд, сэпарыраваньне і дасьледваньне на разьліўных пунктах. 4 арк., т. 10.000, ц. 25 к.

Напісана популярнаю моваю, разьлічана на малакаведаў колгасаў і саўгасаў.

Арлоўскі І.— Як складаць кармавыя рацыёны для малочных кароў. 3 арк., т. 12.000, ц. 25 к.

Круглоў, В аграном.— Выканаем пляны па сацыялістычнай жывёлагадоўлі 3 арк. т. 7000, ц. 20 к.

Адпавядае чарговым задачам сацыялістычнае жывёлагадоўлі ў БССР. Напісана популярна. Разьлічана на колгасьнікаў.

Вардомскі К.— Як падвысіць удойнасьць каровы, 1,5 арк., т. 7000, ц. 10 к.

Адстайнаў.— Памятка разьязднога мэханіка ст. 112 т. 10.000, ц. 30 к.

Нурынаў.— Соцыялістычная фабрыка малака, масла і сыру. (Перааапрацаваны даклад на XVI-м зьезьдзе Саветаў) ст. 40. т. 7000, ц. 10 к.

Кніжка актуальная, напісана популярна і зразумела.

Басарскі Т.— Памятка культармейцу аб задачах масава-культурнай работы ў раёне. ст. 44. т. 3.000, ц. 10 к.

Драздоў.— Расьліны для сілосу. (Вынікі з досьледаў с-г дасьледчых станцый і буйных соцыялістычных гаспадарак (БССР) ст. 108 т. 7000, ц. 65 к.

Тарасаў М.— Лён. ст. 56. т. 7000, ц. 25 к,

Лубоўскі.— Забясьпечым саўгасы і колгасы кармамі ст. 100 т. 10.000, ц. 35 к.

Мяжэвіч Ул.— Крок у будучыню. Аб героях 2-ой бальшавіцкай вясны. ст. 48. т. 5000, ц. 35 к.

ВАЙСКОВЫ СЭКТАР

„Настаўленьне РСЧА". Тактычнае вывучэньне і манэўры (1929 г.) 8,5 арк., т. 3000. ц. 45 к.

Бязукладнікаў.— Як зьберагчы здароўе ў час паходу. $4\frac{1}{4}$ арк., т. 5000, ц. 30 к.

Кіраўніцтва па службе хэмічных каманд ТДАвіяхэму". 6,5 арк., т. 3.000, ц. 20 к.

„Чырвонаармейскі палітпадручнік" Агульны палітычны курс. разьдз. 1 Капіталістычная і соцыялістычная сыстэмы гаспадаркі. $2\frac{3}{4}$ арк. т. 4.000, ц. 25 к.

Буйвалінскі.— З богам і мячом. ст. 56 т. 5.000, ц. 35 к.

Удала пададзены факты пра ганебныя справы духавенства і пра тое, як яно цяпер дапамагае капіталістым рыхтаваць напад на Савецкі Саюз. Каштоўны антырэлігійны дапаможнік масаваму чытачу.

Памятка чырвонаармейцу аб зьберажэньні вінтоўкі.—(Злажыў Палякоў А. Ухвалена тэхнічным штабам Начальніка ўзбраеньня (РСЧА) ст. 32. т. 5.000, ц. 10 к.

Дзераўцоў С.— Памятка чырвонаармейцу аб броне-сілах. ст. 28 т. 3.000, ц. 15 к.

Урбановіч Н.— Службовы сабака, як яго разводзіць навучаць і выкарыстоўваць. (Популярны дапаможнік для членаў сэктару службовае сабакагадоўлі ТДАвіяхэму) ст. 160 т. 3.075, ц. 1 р. 10 к.

Карысна ня толькі організацыям ТДАвіяхэма але і ўсім іншым організацыям і аматарам гэтае справы. Кніжка дасьць штуршок да гадаваньня сабак службовых парод, замест няпершых гаспадарскіх сабак.

Косачоў.— 1-я конная (баявыя ўспаміны ўдзельніка). Для дзяцей старэйшага ўзросту. ст. 112. т. 5.000, ц. 26 к.

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ СЭКТАР

Лынькоў М. Апошні зьверыядавец. Выд. II. 9,5 арк. т, 3.000, ц. 90 к. Кніжка дае малюнак жыцьця на гуце.

Ляшко.— Доменная печ. $10\frac{1}{4}$ арк. т. 3.000, ц. 70 к.

Сташэўскі.— Пад местачковым месяцам. (Аповесьць) 10 арк. т. 3.000, ц. 1 руб.

У рэальных фарбах паказана местачковае жыцьцё, перабудова мястэчка, клясавая барацьба ў процэсе гэтай перабудовы і перамога новага.

Крапіва.— Хвядось-Чырвоны нос. 6 арк. т. 3.000, ц. 1 р 55 к. Казка Крапівы высьмейвае багэму ў літаратурным жыцьці.

Мікуліч.— Чорная вірня. (Новэлі) 8 арк, т. 5.000, ц. 90 к.

Гірчак Е.— Хвілёвізм. (Спроба палітычнай характарыстыкі) 10 арк. т. 3.000, ц. 60 к.

Даецца аналіз „хвілёвізму", як праявы буржуазнага нацыяналізму і нават фашысцкага сьветапогляду украінскага камуніста Хвілевага.

Барашка Іл. Асінстан (Нарыс) ст. 24 т. 3.000, ц. 45 к.

Твор прысьвечаны будаўніцтву Асінаўскае электростанцыі. Перш апісваецца старая вёска АРЭХІ, а потым напружаная праца па будаўніцтве і даецца малюнак новых АРЭХАУ. Напісан вершам і прозаю. Разьлічан на юнацкі ўзрост.

Ліхадзіеўскі С. Крывавыя зьвічкі на сьнезе (Поэзія) ст. 24, т. 2.000, ц. 75 к.

Кузьма Чорны. Брыгадзіравы апавяданьні. ст. 104, т. 5.000, ц. 45 к.

У кароценькіх апавяданьнях малюецца жыцьцё рабочых нашых фабрык і соцыялістычныя мэтады працы. Ёсьць кароценькае апавяданьне „Спатканьне зваспаватым чалавекам" з часоў белапольскае акупацыі. Падыходзіць для масавага чытача.

Глебка П. Арка над акіянам. (Поэма) ст. 112, т. 3.000 ц. 1 р. 25 к.

Спроба адлюстраваць у мастацкай форме клясавае змаганьне і соцыялістычнае будаўніцтва. Напісана цікава.

ЮНАЦКА-ДЗІЦЯЧЫ СЭКТАР

Івіч А.—Пяць уцекаў. 5,5 арк. т. 5.000, ц. 30 к. Знаёміць, як змагаліся за царом з няволяю як зьняволеныя ўцякалі з выспаў. Напісаны популярнаю моваю і чытаецца з захапленьнем.

Ляшэвіч Э. Сьвятло з гораду. Маладыя тэхнікі (Апавяданьні) $5\frac{1}{4}$ арк. т. 5000, ц. 45 к. Кніжка знаёміць чытача, як самому зрабіць радыёпрыёмнік. Карысна школьнікам старэйшага ўзросту.

Ногін В. У краіне палярнага холаду $5\frac{1}{4}$ арк. 5000, ц. 55 к. Аўтар апісвае ссылку, дзе ён прабыў некалькі год і дае прыгожае апісаньне краю.

Ракіцкі П. Усё жывое з аднаго кораню. $4\frac{3}{4}$ арк., т. 5000, ц. 25 к. Знаёміць у популярнай форме з пытаньнямі, якія зьвязаны з гісторыяй зямлі і паходжаньнем жывёльнага сьвету.

Сьмірноў Н. На трактары. 2 арк. т. 6000 ц. 10 к.

Знаёміць з тым, як Сталінградзкі завод зрабіў уплыў на бяспрытульную моладзь, як уцягваў яе ў працу і зусім перавыхаваў.

Ляшэвіч В. Парады маладому тэхніку. (162 практычныя парады і рэцэпты з 39 мал.) 6 арк. т. 7000, ц. 35 к. Кніжка дапамагае дзіцячым тэхнічным станцыям і гурткам у іх працы на тэхніцы.

Разанаў А. Самалёт. 4 арк., т. 6000., ц. 35 к Чытаецца з вялікаю цікавасьцю і дае ў лёгкай форме сапраўднае разуменьне канструкцыі самалёту.

Стэрлігаў У. На самалёце ў Амэрыку. 5,5 арк., т. 4.000, ц. 35. к.

Падрабязна апісваюцца ўсе цяжкасьці пералётаў. Чытаецца з вялікім захапленьнем.

Варыч. Авіягурток. ст. 64 т., 5.000 ц., 25 к

Енукідзе. Бальшавіцкія нелегальныя друкарні. ст. 104, т. 5.000, ц. 30 к.

Даецца адзін з выдатных малюнкаў арганізацыі, друкаваньня і распаўсюджваньня бальшавіцкага друку сярод рабочае клясы ў часы самаўладзтва.

Курэла А. Прыгожае жыцьцё. ст 96 т. 3.000, ц. 40 к.

Разглядаецца проблема „прыгожага жыцьця", змагаючыся супроць буржуазнага разуменьня гэтага пытаньня, супроць старога „густу". Аддаецца вялікая ўвага пытаньню нараджэньня новага мастацтва, паказваюцца практычна шляхі і мэтады працы па мастацкім афармленьні нашага быту. Вельмі цікавая і каштоўная кніга.

Міслаўскі М. Магнітагорск. ст. 32, т. 3.000, ц. 30 к.

Напісана популярнаю моваю. Для масавага чытача.

Хітараў. Супроць вайны і фашызму. ст. 80, т. 5.000, ц. 15 к.

Фульма Ф. Дзеньнік Румынскага салдата. (люты 1928—травень 1929г.) ст. 80 т. 3.000 ц. 25к.

ТЭХСЭКТАР

Сафронаў Д. Інж. Даведнік раманцера. 3 арк, т. 3.000, ц. 75 к.

ВУЧПЭДСЭКТАР

Ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, (Пастановы ЦК КП(б)Б, СНК і ЦВК БССР). 1 арк., т. 10.000, ц. 05 к.

Інфармацыйна-мэтодычны ліст № 3, 1 арк. т. 3000 ц. 07 к. **Мяшалкіна-Сіўко. Лукіна Л:**— Будзь гатоў. (Кніжка на чытаньне для 1 году навуч. вясковых першапачатковых школ). Вып. II-і 9 арк., т. 100.000, ц. 52 к.

Бурдзянскі І. Н. Асновы рацыяналізацыі вытворчасьці. Падручнік для комвузаў, рабочых унівэрсытэтаў і сеткі профтэхасьветы. Выд. II-е дапоўненае. (I-е выданьне прэміравана НКАсьветы РСФСР) 25,5 арк., т. 10.000. ц. 1 р. 70 к.

Бярэзін А А і інш. Рабочая кніга па прыродазнаўству (V год навучаньня). Пад рэдакц. Б. В. Усесьвяцкага і Б. В. Ігнацьцява. 16,5 арк. т. 40.000, ц. 1 р.

Сінявока і інш. Па Ленінскім шляху. (Рабочая кніга для III году на учаньня пачатковай школы ФЗС, КС і ШКМ). Вып. II-і. 14 арк. Тыраж 130.000, ц. 50 к.

Вольфсон Б. і Гак Г. Нарыс гістарычнага матэрыялізму. Дапаможнік для саўпартшколы і марксыцка-ленінскіх гурткоў. 20,0 арк., т. 20.000, ц. 95 к.

Пакроўскі М. Руская гісторыя ў самым сьціслым нарысе. частка 3-я, XX стагодзьзе. вып. 1-ы (1896—1906 г. г.) ст. 348, т. 25.000, ц. 1 р. 20 к.

Пруднік і інш. Юныя колгасьнікі (Чытанка для II-й груп ШКП. вып. II-гі пад рэдакцыяй Прудніка Т. і Саладухі А.) ст. 164, т. 20.000, ц. 95 к.

Проэкт програмы I—IV груп ФЗС, ШКМ і пачатковае школы. Паясьняльная запіска, навучальны плян, родная мова, расійская мова, матэматыка, грамадазнаўства, геаграфія, прыродазнаўства, палітычная праца, ст. 128, т. 28.000, ц. 45 к.

Проэкт програмы па матэматыцы і фізыцы для V—VI і VII-й груп ФЗС і ШКМ. ст. 23, т. 5.000, ц. 15 к.

Алексапольскі Н., Красоўскі Ф., Чабатароў А. Курс геодэзіі. (Пад рэдакцыяй проф. Красоўскага Ф.) частка II-я, ст. 360 т. 3.000, ц. 4 р. 15 к.

Вушканец С. і інш. Нашым кадрам. Комплексная кніжка для IV году навучаньня ФЗС і ШКМ. вып. II-гі. і ст. 288, т. 100.000 ц. 1 р.

Касабуцкі А. Сагаловіч Г. і Бандарын А. Рабочая кніга па матэматыцы. V год навучаньня. вып. II-гі ст. 148, т. 35.000 ц. 45 к.

Асноўныя прынцыпы пабудовы праграм для пачатковай і сярэдняй школы паводле пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ад 5 верасьня 1931 г. (Тэзісы). ст. 8, т. 10.000 ц. 5 к.

ПЭРЫЯДСЭКТАР

„Комуністычнае выхаваньне" № 10 і 11 за 1931 год, 9,5 арк. т. 5.000, ц. 95 руб.

„Маладняк" .Кніжка № 10 за 1931 год 12,5 арк., т.3.000, ц. 50 к.

„Чырвоная Беларусь" № 20—21 (Кастрычнік—лістапад 1931 г.) ст. 24, т. 7.500, ц. 25 к.

Завочны Комуністычны Унівэрсытэт. (Навучальна мэтодычны дапаможнік для завочнага навучаньня і самаадукацыі партактыву). Гісторыя міжнароднага рэволюцыйнага руху. № 3, ст. 68, т. 3.000, ц. 50 к.

НАЦСЭКТАР

(Літ. на польскай мове)

МАСПАРТПАЛІТСЭКТАР

Унукаў. Ці страшна нам ваенная тэхніка 2 арк. т. ц. 20

Пастановы ЦК Усе КП(б) і КП(б) Б пра пачатковую і сярэднюю школу, стар. 16 т. 2.000, ц. 10 к.

Курцік А. Самая моцная, самая вострая зброя партыі, стар. 144, т. 3000, ц. 80 к.

Івін. Савецкі Кітай. стар. 104 т. 3.000 ц. 50 к.

Рэзолюцыі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК ад 12—16 лістападу 1931 году, стар. 43, т. 3.000, ц. 20

Кагановіч. Бальшавіцкае вывучэньне гісторыі партыі. Стар. 28, т. 3.000 ц. 15 к.

Будзёнаў, Данішэўскі і Голен М.—За бальшавіцкую рацыяналізацыю ст. 83 т. 3.000 ц. 40 к.

СЕЛЬГАССЭКТАР

Скамарохаў. Беражыце быдла ад заразы 3/4 арк., ц. 06 к.

Маскалёў. Малочная гаспадарка ў спажывецкай палгасе. 1 1/2 арк., ц. 15 к.

Залескі А. Разьмеркаваньне прыбытку ў колгасах паводле працаднёў. стар. 32 т 2.000 ц. 15 к.

Бондар Г. Паніматко П. Сельская гаспадарка БССР, стар. 57. т. 3.000, ц. 25 к.

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ СЭКТАР

Стаўскі. Станіца. стар. 135 т. 2.000 ц. 1р. 20 к.
Вайнгауз. На варце. стар, 92. т. 3.000, ц. 90 к.
Поэзія БЕЛАПП'у. стар. 56 т. 2.000 ц. 60 к.

ВУЧПЭДСЭКТАР

Хімава Першы Ударнік. Частка II-я. Для III-га году навучаньня. 8 1/2 арк., ц. 90 к.

Магілянскі І. і Лейбовіч Э. Прыродазнаўства (у барацьбе за соцыялістычную сельскую гаспадарку) частка 1-я, для V году навуч. стар. 272 т. 5.000 ц. 1р. 80 к.

Лейбовіч і Магілянскі. Прыродазнаўства частка II-я для V г. навуч. стар. 128 т. 5.000 ц. 90 к.

ВЫШЛІ З ДРУКУ З 1 ПА 15 ЛЮТАГА

ПАРТМАСПАЛІТСЭКТОР.

Бухарын Н. Змаганьне двух сьветаў, і задачы навукі. (Даклады на надзвычайнай сэсіі ў Маскве 21—27 чэрвеня 1931г.) ст. 40, т. 3.000, ц. 20к.

ЦКК КПбБ у барацьбе за правядзеньне генэральнай лініі партыі. ст. 52 г. 3.500, ц.

ЦКК РСІ ў барацьбе за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі. ст. 68, т. 3.000, ц.25к.

Постышаў. За большавіцкае выхаваньне новых кадраў камсамолу. (Даклад на 3-м Пленуме ЦК УсеЛКСМ 9-га сьнежня 1931 г.) ст. 32, т. 10.000, ц. 15 к.

Сталін. Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму. (Пісьмо ў рэдакцыю часопісі „Пролетарская Революция". ст. 16 т. 5.000. ц. 10 к.

Арскі Р. Урал і Кузбас у змаганьні за соцыялізм. ст. 48 т. 4.000, ц 25 к.

Кагановіч Л. За бальшавіцкае вывучэньне гісторыі партыі. (Прамова на сходзе прысьвечаным дзесяцігодзьдзю Інстытуту Чырвонай Профэсуры,—1-га сьнежня 1931 году). ст. 36 т. 10.000, ц. 10 к.

Сталін. На шляхох да Кастрычніку. (Артыкулы і прамовы. Сакавік-Кастрычнік 1917 г.) ст. 102 т. 5.000, ц. 1 руб.

Гурнік Я. Пятля на шыі польскага гарняка сьціскаецца. Пад рэдакцыяй і з прадмовай Канакоціна. ст. 104 т. 5.000, ц. 45 к.

Горкі М. Будзем на варце. (Артыкулы) ст. 132 т. 5.000, ц. 70 к.

Гняздоўскі. Соцыял фашысты перад фашысцкім судом. ст. 40 т. 5.000, ц. 15 к.

Сталін І. Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва. Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму. ст. 4 т. 3000, ц. 25. к,

СЕЛЬГАССЭКТОР.

Круглоў і Рагоўскі С. Ахова здароўя сельскагаспадарчых жывёл. Для сьвінароў скотнікаў, канюхоў і г. д. ст. 32 т. 7.000 ц. 07 к.

Букбард. Хаваньне малака і догляд яго. ст. 72 т. 7.000, ц. 25 к.

Галахаў. Шкоднікі лёну і змаганьне з імі ст. 48 т. 3.000, ц. 20 к.

Вечар А. Агр. Прамысловая сушка бульбы ст. 100 т. 3.000, ц. 35 к.

Сьмірноў. Вырашчваньне сланэчніку на сілос. ст. 64 т. 10.000, ц. 12 к.

Кудзінаў С. Папярэдняе разьмеркаваньне даходаў у 1931 г. у колгасе „Новы шлях" ст. 24 т. 5,000, ц. 10 к.

Берзін І. Культура канапель на Беларусі ст. 56 т. 5.000, ц. 25 к.

Гурын Г. Асновы вэтэрынарыі. (З другога расійскага выданьня) ст. 88 т. 6.000, ц. 40 к.

Пешкін І. Савецкае машынабудаўніцтва. ст. 40 т. 3.000, ц. 25 к.

Маркавец. Аграном. Шкоднікі саду і спосабы барацьбы з імі ў БССР. ст. 32 т. 5.000, ц. 20 к.

Фэафанаў. Пераробка аднакорпусных плугоў на двухкорпусныя. ст. 24 т. 3т. ц. 15 к.

Александраў В. Вэтэр. д-р—Сап у жывёлы і чалавека і барацьба з ім. ст. 36 т. 7.000, ц. 10 к.

Ляўша. Даведнік па канегадоўлі. ст. 68 т. 7.000. ц. 20 к.

Ройтэрштэйн. Палявы рамонт трактараў і сельска гаспадарчых машын. ст. 100 т. 5.000 ц. 65 к.

ЭПРАЎСЭКТОР.

Губкін І. Прыродныя багацьці СССР і іх выкарыстаньне. ст. 74 т.3.000 ц.35 к.

Сукало. Лесасплаў у соцыялістычным будаўніцтве. Выданьне ІІ-е папраўленае. ст, 36 т. 5.000 ц. 10 к.

Рубашоў, Проф-сьмяротнасьць пры хірургічных захворваньнях і змаганьне з ёю, (Соцыяльна-клінічны нарыс). ст, т, 2,000. ц. 2,80.

Зборнік пастаноў аб новых сыстэмах заработнае платы для служачых кіраўнічага. апарату. ст, 60, т, 3.000, ц. 85 к.

Кантаровіч і Ольхін. 4-х брыгадны графік. Як ліквідаваць абязьлічку пры трохзьменнай бесьперапыннай працы. ст, 28 т.5·000 ц. 10 к.

ВАЙСКОВЫ СЭКТОР

Грыгорыо Ю. Служба і сродкі сувязі. Навучальны дапаможнік для ВНУ, ваенізаваных курсаў сувязі і пастоў ПНАС Асоавіяхэму ст. 216 т. 3.000, ц. 2 р 70 к.

Коняў Н. На Савецка-Кітайскай граніцы. ст. 68 т. 3.000, ц. 30 к.

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ СЭКТОР.

Галавач. Вінаваты. Аповесьць. Выд. ІІ-е ст. 144 т. 5.100, ц. 60 к.

Лясны Н. Вялікае нараджэньне. Эскізы. ст. 132 т. 5.100, ц. 65 к.

Эпік Г. Сустрэча. ст. 148 т. 3.000, ц. 30 к.

Галіна В. Баявы савет. ст. 40, т. 2 000, ц. 60 к.

ЮНДЗЕТСЭКТОР.

Маякоўскі. Як узяць да ладу, што добра, блага. ст. 16 т. 5.000 ц. 50 к.

Драпкіна. Тэхнічныя вечары. ст. 16 т. 6.000, ц. 10 к.

Уліцкі. Консэрвы для кароў. (Сілос). ст. 52 т. 7.000, ц. 15 к.

Кудзелі П. Маё першае мая, ст. 28 т. 5.000. ц. 10 к.

Лявіціна і малалетка. Падводныя драпежнікі. ст. 104 т. 5.000 ц. 35 к.

Гальянаў і Янаў. Новыя задачы шэфства над флётам. ст. 64 т. 3.000 ц. 30 к.

Дураў Ул. Птушкі—артысты. (Муштраваныя птушкі дзядулі Дурава). ст. 68 т. 7.000 ц. 30 к.

ТЭХСЭКТОР.

Прэс Л. Мэханічная апрацоўка дрэва. З 259 фігурамі ў тэксьце. ст. 272 т. 3·000 ц. 1р. 75 к.

ВУЧПЭДСЭКТОР.

Проэкт програмы по гэографіі для V, VI. і VII-й груп ФЗС і ШКМ. ст. 52 т. 5.000, ц. 30 к.

Ламскі проф. Патолёгічная фізіолёгія хатніх жывёл. Агульная патолёгія—дапаможнік для студэнтаў вэтэрынарных ВНУ. ст. 288 т. 3.000, ц. 3р. 35 к.

Програма па прыродазнаўству для V, VI і VII-й груп школ ФЗС і ШКМ. ст. 24 т. 5.000 ц. 15 к.

Пігулеўскі. Бальшавік. Кніга для працы і чытаньня пасьля лемантара, для І-га году навучаньня. ст. 168 т. 40.000, ц. 60 к.

Програма і заданьні па зоолёгіі на 1931-32 навуч. год. ст. 24. т. 3.000 ц.

Кайгарадаў. Проф. Чатырохзначная табліца лёгарытмаў, антылёгарытмы натуральных трыгонамэтрычных велічынь і іх лёгарытмаў. пераводу градусаў у радыяны квадратных каранёў, адваротных велічынь, паказальнікавых і гіпэрболічных функцый. З падробным настаўленьнем да карыстаньня імі. ст. 64 т. 3.000 ц. 1р. 50 к.

Рубашоў. проф. Кароткі падручнік клінічнай хірургіі. Для студэнтаў мэд. ВНУ ст. 432 т. 3.000 ц. 7р. 60 к.

Лапідус і Астравіцянаў. Політычная экономія. (Тэорыя таварна-капіталістычнай гаспадаркі) нарыс тэорыі савецкай гаспадаркі ст. 412 т. 27.000 ц. 1р. 50 к.

ПЭРЫОД. СЭКТОР.

„Узвышша" № 10 за Кастрычнік 1931 г. ст. 142 т. 1.000 ц. 80 к.

„Чырвоная Беларусь" № 22-23 лістапад-сьнежань 1931 году. ст. 22 т. 7600 ц. 20 к.

ДРУКУЮЦЦА

МАСПАРТПАЛІТСЭКТОР.

Гнядоўскі С. Соцыял-фашысты перад фашысцкім судом. 1,5 арк.

Інстытут Масавага Завочнага Навучаньня, пры ЦК КП(б)Б. Дадатковая вартасьць. 1 арк. Для партактыву.

Карл-Маркс. Наемная праца і капітал. 1,5 арк.

Логінаў, Бальшавікі ў змаганьні за Кастрычнік. 3 арк.

Популярна перадаецца гісторыя змаганьня бальшавікоў за Кастрычнік, даецца агляд эканамічнага становішча Расіі, расстаноўкі клясавых сіл, становішча партыі да лютага 1917 году, люты, змаганьне за масы, добра паказваецца роля Леніна, змаганьне з правымі і „левымі", змаганьне з апартунізмам меншавікоў і эсэраў, падрыхтоўка і ход Кастрычніка. Пытаньні гісторыі зьвязваюцца з сучаснасьцю,—ухілы ў час Кастрычніка з пазьнейшымі ўхіламі.

Калмык. Парторганізацыя і камсамол за вясновую сяўбу. 3 арк.

Знаёміць чытача з устаноўкамі нашае партыі ў галіне сельскае гаспадаркі, падаецца шмат фактаў, што характэрызуюць добрыя і дрэнныя бакі колгаснага і саўгаснага будаўніцтва наогул і організацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў у прыватнасьці. Разьлічана на комуністаў і камсамольцаў, што працуюць ў саўгасах і колгасах і на саўгасна-колгасны актыў.

Гукоўскі А. Антанта і Кастрычніц ая Рэволюцыя. 10 арк.

На падставе архіўных матэрыялаў паказваюцца дачыненьні саюзьнікаў у розныя этапы да царскага і часовага ўраду, да Карнілаўшчыны і да ўлады Саветаў, падаюцца матывы, што былі ў аснове дачыненьняў саюзьнікаў розных падзей у кожным выпадку. Асабліва падкрэсьлена тактыка Леніна ў дачыненьні да прапановы вялікіх дзяржаў падтрымаць у змаганьні з Нямеччынай. Яскрава паказаны асноўныя рысы вялікіх дзяржаў (Антанты): іх дачыненьне да Кастрычнікаўскае Рэволюцыі і актыўная інтэрвэнцыя ўсімі сродкамі супроць СССР.

Яраслаўскі. Змаганьне супроць рэлігіі і нацыяналізму—змаганьне за соцыялізм. 0,5 арк.

Шмідт А. Як чалавек зрабіўся чалавекам. 2 арк.

Кавацееў. Рабочая кляса і соцыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі. 4 арк.

Гэссэн Ул. Маркс, Энгельс і Ленін пра польскае паўстаньне 1863 г. 6 арк.

Рол скі. Хмары над Германіяй. 2, 6 арк

Палітычна вытрыманая інформацыя пра становішча ў Нямеччыне.

Постышаў. За большавіцкае выхаваньне кадраў камсамолу. 1, 1 акр.

СЕЛЬГАССЭКТОР.

Ісаеў А. Змазка трактароў. 8 арк. Патрэбна, як дапаможнік для сельска-гаспадарчых тэхнікумаў і ВНУ. Напісана популярнаю моваю.

Іваноў, Лясны гадавальнік. 3 арк. Популярна і падрабязна высьвятляюцца тэхнічныя пытаньні, зьвязаныя са штучным разьвядзеньнем лесу ў лясных гадавальніках. Разьлічана на шырокія колы колгасьнікаў, саўгасьнікаў і работнікаў МТС.

Філарэтова, Шышко і Ягараў Захаваньне насеньня лёну і канапель 3 а к. Разглядаюцца страты ад засьмечанасьці насеньня. Даецца характарыстыка рознага пустазельля паводле формы і афарбоўкі іхняга насеньня. Паказваецца на якіх машынах і якое пустазельле можа быць адлучана ад насеньня. Апісваюцца машыны чысьціць насеньне і догляд іх Даецца вызначэньне якасьці насеньня.

Міхалкоў. Кіраўніцтва па прамысловасьці птушніцтва. ІІ-я частка. 8 арк. Каштоўная тым, што апрача агульных пытаньняў, правільна высьвятляе пытаньне значэньня племяннное работы. Знаёміць з практычнаю пастаноўкаю яе. Падручнік для сельска-гаспадарчых жывёлагадоўчых тэхнікумаў.

Міхайлаў В. Кіраўніцтва па прамысловасьці птушніцтва (выхаваньне куранят) 4-я частка. 5 арк. Популярнаю моваю высьветлены пытаньні, зьвязаныя з выхаваньнем куранят, правільным натуральным і штучным кармленьнем іх. Дадзены прычыны няўдач пры гадаваньні куранят. Іхнія хваробы і бракоўка. Разьлічана на работнікаў птушкаводных гаспадарак, курсы тэхнікумаў і г. д.

Салаўёў. Пытаньні гэнэтыкі. 4 арк.

Пісараў На барацьбу з сарняком. 2 арк. Карысная і патрэбная для кампаніі веснавое сяўбы.

Бра шэр. Практыка па фізыолёгіі расьлін. 5 арк.

Вавілаў Н. Агранамічная навука ва ўмовах соцыялістычнае сельскае гаспадаркі 1 арк.

Апрацаваны даклад прэзыдэнта сельска-гаспадарчае Акадэміі імя Леніна, што ён зрабіў на першай Усебеларускай конфэрэнцыі па плянаваньню навукова-дасьледчае работы ў красавіку 1931 году. Зьмяшчае багаты матарыял, лічбы, ставіць жыцьцёвыя проблемы ў сувязі з соцыялістычнаю рэконструкцыяй сельскае гаспадаркі. Разьлічана на спэцыялістаў сельскае гаспадаркі, студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў, на сельска-гаспадарчы актыў саўгасаў і колгасаў і на партыйна-камсамольскі актыў вёскі.

Знаменскі. Цельнасьць і ялавасьць кароў. 2 арк. Кніжка тэхнічная. Разьлічана на спэцыялістых.

Шаян. Земляная ігруша—кармавая культура. 3 арк. Зьмяшчае ўсё, што трэба ведаць пра культуру гэтай надзвычай цікавай расьліны. Земляная ігруша павінна знайсьці належнае мейсца і ва ўмовах нашых соцыялістычных гаспадарак, перш-на-перш жывёлагадоўчых.

Рабочая програма і палажэньне аб організацыі працы МТФ. 2,5 арк. ІІ-е в д.

Пастанова Колгасцэнтру і Малколгасцэнтру СССР. Пра організацыю рацы ў малочна-таварных фэрмах СССР. У другой частцы зьмешчана палажэньне пра організацыю працы у жывёла-гадоўчых малочна-таварных фэрмах БССР, зацьверджаная Колгасцэнтрам БССР і ўпаўнаважаным Малколгасцэнтру. Разглядаюцца пытаньні: зьдзельшчына, улік працы, організацыя брыгад, унутраны распарадак на МТФ, абавязкі работнікаў МТФ, прэміяваньне, вытворчыя нарады, соцспаборніцтва і ўдарніцтва. ІІ-е выданьне дае зьмены норм выпрацовак. Разьлічана на працаўнікоў МТФ і колгасаў, студэнтаў сельска-гаспадарчых ВНУ і тэхнікумаў.

Бардзёнак.- Заразьлівыя хваробы жывёлы, якія не пераходзяць на чалавека. 1 арк. Высьвятляецца якія ёсьць заразьлівыя хваробы ў жывёлы і як з імі трэба змагацца. Патрэбна жывёлагадоўчым саўгасам і колгасам, гурткам па вэтэрынарыі і бібліатэкам саўгасвучаў.

Кароп І.- Як організаваць работу МТС. 6 арк. Напісана зразумела і популярна. Разьлічана на саўгасныя і колгасныя кадры, на вучнёўскую моладзь і галоўным чынам на работнікаў МТС. Ёсьць дадаткі і матар'ялы пра вынікі работы МТС за 1931 г. па БССР.

Захарэнка. інжынэр Абсталяваньне скотных двароў падвеснымі пуцямі ў колгасах і саўгасах. 2 арк.

Дапаможа мэханізаваць вытворчасьць саўгасаў і колгасаў, ашчадзіць фізычную малавытворчую працу, замяняючы яе мэханізаванаю працаю. Аўтар адзін з вынаходцаў гэтае справы таннае абсталяваньне сам ужыў у адным саўгасе пад Менскам. Тэма надзвычай цікавая і новая. Патрэбна кожнаму дырэктару саўгасу і ў буйных колгасах, асабліва жывёлагадоўчых.

Іваноў К. Організацыя лясной гаспадаркі і карыстаньне лесам. 8 арк.

Популярнаю моваю высьвятляюцца пытаньні, зьвязаныя з організацыяй лясоў, іх выкарыстоўваньнем і г. д. Знаёміць з тэхнічным бокам лясное гаспадаркі. Цікава ўсім колгасам і саўгасам, што маюць лясы. Патрэбна курсам, студэнтам ляснога тэхнікуму, гурткам і бібліятэкам ШКМ.

Міхайлаў Ф. Барацьба з пажарамі ў колгасах, саўгасах і МТС хэмічнымі агнетушыцелямі 2 арк.

Знаёміць з пабудоваю і найбольш рацыянальнымі прыёмамі догляду і ўжываньня хэмічных агнетушыцеляў. Паказваюцца іх тыпы якія найлепш падыходзяць у сельскай гаспадарцы. Кніга патрэбна, як дапаможнік у кожным саўгасе, колгасе і МТС. Разьлічана на вясковы актыў.

ВАЙСКОВЫ СЭКТАР

Каліноўскі. Проблема матарызацыі і мэханізацыі сучасных армій. 4 арк, (Даклад на паседжаньні вайсковае сэкцыі пры Комакадэміі 29/XI-31 г).

Рэзолюцыі 3-й Усебеларускай нарады сакратароў ячэек УсеКПб. 3 арк. (Пераклад з расійскае мовы). 3 000, ц. 35 к.

Вышэйшы Савет Фізычнага Выхаваньня Беларусі. Вучэбна-мэтодычная работа ў колектыве фізвыхаваньня. 2 арк.

Васіленка. Чырвонаармеец у разьведцы 2 арк.

Падаецца добры практычна-мэтодычны матарыял для чырвонаармейца. Чытач знойдзе ўсё, што патрабуе програма баявое падрыхтоўкі чырвонаармейца на 1932 год.

Чырвонаармейскі падручнік. (Разьдз. 7-ы) 2,5 арк.

Гарніч. Васемнаццаты. 14 арк.

Адлюстроўваецца час фармаваньня першых чырвонаармейскіх атрадаў іх змаганьне ў грамадзянскай вайне. Аўтар быў непасрэдны ўдзельнік апісаных у кнізе зьяў і падзей.

Разьвіцьцё вайсковай тэхнікі ў XX стагодзьдзі. (Пераклад з расійскае мовы) 5 арк.

Знаёміць чытача з разьвіцьцём вайсковае тэхнікі, тактыкі і стратэгіі ў вайне XX стагодзьдзя. Падыходзіць вайсковаму актыву, начскладу запасу і ТДАвіяхэмаўцам.

ВСФКБ. Масавая работа ў колектыве фізкультуры. 2,5 арк.

Салаўсу. Пабудова гармат.

Патрэбна чырвонаармейцам і малодшым камандзірам, асабліва артылерыстым, для элементарнага знаёмства з матарыяльнаю часткаю артылерыі, яе прызначэньнем, пабудоваю снараду, часткова-баявымі і тактычнымі ўласьцівасьцямі.

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ СЭКТОР.

Глебка П. Арлянка (Поэма) 2,5 арк.

Хацкевіч. Налівайся колас. (Вершы) 8 арк

Падыходзіць да кампаніі веснавое сяўбы, бо вершы прысьвечаны, галоўным чынам, сельска-гаспадарчым кампаніям. (Вясна-восень). Напісаны бадзёра і жывою моваю. Могуць дэклямавацца ў сувязі з правядзеньнем кампаніі веснавое сяўбы.

Галавач П. Спалох на загонах. (Аповесьць) ІІ-е перапрацаванае выд. 12 арк.

Аповесьць паказвае той складаны процэс павароту асноўных бядняцка-серадняцкіх мас што перарабляе вёску на новы соцыялістычны колектывізацыі. Замалёван ён удала, паказаны ўсе супярэчнасьці на фоне падзей у горадзе і змаганьня з апартунізмам паасобных „партыйцаў". Чытаецца з цікавасьцю. Твор даступны самым шырокім колам чытачоў.

Каваль В. Крыніца. 2-е выданьне. 6 арк.

З мастацкага боку кніжка напісана добра. У другім выданьні зроблены некаторыя зьмены.

Стандэ. Выбраныя вершы. 5 арк.

Вершы гэтага зборніка друкаваліся раней на польскай мове у розных зборніках і часопісах ў пэрыод 1924-31 году. Яны характарызуюць дзейнасьць і разьвіцьцё поэты.

Ванэк. Прыгоды ўдалаг ваякі Швэйка. частка 5-я. 13,5 арк.

Сянкевіч А. Вандраваньне Васіля. (Аповесьць) 2 арк.

Паказваецца жыцьцё селяніна, што трапіў у Амэрыку і пад прыгнётам цяжкое эксплёатацыіператварыўся ў клясава-сьвядомага рабочага. Каштоўная тым, што ў ёй даецца малюнак сапраўднага становішча ў Амэрыцы рабочых эмігрантаў.

Каваль В. Выбраныя творы. II арк.

Адлюстроўваюць у некаторай ступені сапраўднае сялянскае жыцьцё да рэволюцыі і маюць значную мастацкую вартасьць. Да твораў дададзена прадмова Кучара.

Баранавых С. Чужая зямля. 7 арк.

Паказваецца актыўнасьць батрацтва ў змаганьні за зямлю і як гэта актыўнасьць няспынна ўзрастае,

Баранавых С. Межы. 8 арк.

Даецца ілюстрацыя змаганьня за колгасы.

Верны Ц. Сымфонія гэроічных будняў. 2 арк.

У 1-ай частцы зьмешчаны нарысы ў якіх адлюстроўваецца гэроічнае змаганьне камсамолу і колгасьнікаў за пабудову соцыялізму. Адлюстраваны новыя формы соцыялістычнае працы: соцспаборніцтва, ударныя брыгады, грамадзкі буксір і г. д. Паказана клясавае змаганьне на вёсцы. II-я частка „Рагаткі" зьмяшчае газэтныя фэльетоны сатырычнага і гумарыстычнага характару, у якіх выкрываецца шэраг адмоўнага з нашае сучаснасьці: галавацяпства, бюрократызм, скажэньне нацпалітыкі і інш. і тэма і форма кніжкі робяць яе цікаваю і карыснаю.

Лынькоў М. Андрэй лятун. II-е выданьне. 8, 5 арк.

У гэтым выданьні новыя апавяданьні злучаны з апавяданьнямі, якія характэрны для пачатку творчасьці Лынькова. Асноўная рыса ўсіх апавяданьняў—адлюстраваньне жыцьця пасьля Кастрычнікаўскае эпохі і афармленьне ў гэты час людзей. Цікава ў зборніку тое, што аўтар закранае новыя для беларускай літэратуры пытаньні: Местачковае жыцьцё і перабудова яго на новы ляд.

Гельц М. Ад белага крыжу да чырвонага штандару. 15 арк.

Успаміны Макса Гельца пра змаганьне партызанскіх атрадаў Нямеччыны, пра „дэмократычны" суд над імі, пра цяжкія гады турэмнага зьняволеньня, да якога аўтар быў прысуджан на ўсё жыцьцё, і пра ягонае вызваленьне. Паказаны гэроічныя старонкі змаганьня пролетарыяту Нямеччыны ў 1918-23 гадох.

Галіна В. Апавяданьні. 4, 5 арк.

Апавяданьні выключна „жаночага зьместу". Яны соцыяльна каштоўны і адпавядаюць запатрэбаваньням сучаснасьці. Ставіцца проблема змаганьне за колгасы, проблема навучаньня працоўнае жанчыны, работа шкоднікаў у саўгасе, змаганьня з прарывамі за працоўную дысцыпліну. Ва ўсіх апавяданьнях гэроі жанчыны.

Хадыка Ўл. Выбраныя творы. 4, 5 арк.

Хадыкавы вершы маюць тую асаблівасьць, што яны пазбаўлены трафарэту, у іх багатая рытміка і слоўнік, высокая тэхніка. Аўтар дасканала апрацоўвае тое, што выхо зіць з-пад яго пяра.

Знаёмы С. Лес гарыць. 4 арк.

У гэтым зборніку ад ранейшых сваіх слабых газэтных нарысаў. Знаёмы пераходзіць да сапраўднага мастацкага і актуальнага нарысу, што часам набывае форму новэлі, або апавяданьня. Вострая назіральнасьць, здольнасьць разьбірацца ў складаных абставінах сучаснасьці—адзнакі шпаркага росту Знаёмага.

Гартны Ц. Сокі цаліны. (Збор твораў том 3-і) 33 арк.

Гартны Ц. Сокі цаліны (Збор твораў том 4-ы) 34 акр.

„Сокі цаліны" першы роман у беларускай літаратуры. Ён займае вялікі гістарычны час ад рэволюцыі 1905 году да лютаўскае рэволюцыі. Перад чытачом праходзіць местачковае жыцьцё дарэвалюцыйнага часу, горад напярэдадні рэволюцыі і ў рэволюцыю. Паказваецца, як галоўны гэрой—Рыгор Нязвычны—з вясковага хлапца праз местачковую рэволюцыйную організацыю, праз працу на заводзе і сувязь з рабочымі буйных цэнтраў вырастае ў сьвядомага рэволюцыянэра, побач з імі шырока паказваюцца людзі тае эпохі самага разнастайнага стану і характару.

Гурскі. Качагары (п'еса) 3 арк.

У мас ацкай форме паказваецца змаганьне з беларускім контрэволюцыйным нацыяналдэмократызмам. У п'есе лёгка пазнаць шэраг вядомых у свой час карыфэеў беларускага нацдэмократызму. Форму паказу даходзяць да чытача (гледача). Патрэбна пролетарскай грамадзкасьці.

Занка. Клін. 4,5

Актуальная тэматыка. На фоне індустрыялізацыі і колектывізацыі краіны ў мастацкай форме паказана соцыялістычнае будаўніцтва.

Мурашка Р. На манэўраных палёх. 2,5 арк.

Нарысы аб рабоце выязднoй рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" ў час манэўраў 1931 году.

Кірыленка. Нацiск (Аповесьць) 7 арк.

Зьмест: жыцьцё сучаснае украінскае вёскі, клясавае змаганьньне ў ёй, збожжазагатоўкі і колектывізацыя. Аўтар—адзін з выдатных пролетарскіх пісьменьнікаў Украіны.

Семашка. Пералом (Апавяданьні) 5 арк.

У зборніку 4 апавяданьні. Тэмы: колгаснае будаўніцтва, паказ таго, як селянін вырашае пытаньне ісьці ў калгас ці не? чытаецца з цікавасьцю.

Шыдлоўскі. На граніцы. (Апавяданьне) 1 арк.

Даецца малюнак зьдзекаў белапалякаў з беларускіх сялян пад Польшчаю, зьдзекаў настаўнікаў з школьнікаў беларусоў у польскіх школах, што прымушаюць дзяцей уцякаць у савецкую Беларусь. Паказана, як яны чыталі ў падпольнай літаратуры, што ў нашых школах беларуская мова ў пашане, што дзецям даюць гарачае сьнеданьне, абутак і ня б'юць іх. Тэма актуальная. Чытаецца з захапленьнем,

Віталін. Будзем жыць. (Вершы). 4 арк.

Вершы ўдала апрацаваны з мастацкага боку. Маюць значную політычна-грамадзкую вартасьць.

ЮНДЗЕТСЭКТОР

Ільін М. Апавяданьне пра вялікі плян 6,5 арк.

З захапленьнем чытаюць і дзеці, і вучоныя, і, нават, замежная буржуазія. Кніжка ня страціць свайго значэньня і пасьля сканчэньня пяцігодкі. Разьлічана на старэйшы і сярэдні ўзрост дзяцей.

Рут К. Маладая работніца на Захадзе 0,5 арк.

Зьмяшчае багаты матарыял, яскравыя факты і лічбы і гэтым знаёміць з умовамі працы маладой работніцы ў капіталістычных краінах. Чытаецца з вялікаю цікавасьцю. Разьлічана на камсамольцаў.

Блісьцінаў Л. Ленінцы. 3/4 арк.

Дзьве інсцэніроўкі да Ленінскіх і Кастрычніцкіх дзён. Разьлічана на піянэр-атрады і школьнікаў.

Гэршэнзон М. Канвэер хлусьні. 2 арк. 17 малюнкаў.

Трапна паказана ўся шалёная агітацыя і хлусьня, што буржуазія ўздымае супроць СС Р і што яна датварае ў сваіх калёніях. Разьлічана на старэйшы і сярэдні дзіцячы ўзрост.

Маўр Я. Аповесьць будучых дзён. 9 арк. 7 малюнкаў.

Кніга прэміявана на Ўсебеларускім конкурсе на лепшую дзіцячую кнігу ў 1930 г. У ёй дадзена спроба паказаць жыцьцё БССР і Заходняе Беларусі праз некалькі пяцігодак. Разьлічана на сярэдні дзіцячы ўзрост.

Куклін С. і інш. Востраў Кільдзін. 2 арк. 5 малюнкаў.

Паказан яшчэ адзін дзікі куток уцягнуты ў соцыялістычную гаспадарку, дзе, апрача іншай прамысловасьці, закладзен і працуе ўжо лёдавы завод. Апісаньне зроблена ў форме падарожжа да свайго дзядзькі. Разьлічана на сярэдні дзіцячы ўзрост.

Маўр Я. Сын вады. 4,5 арк. 15 малюнкаў.

Краязнаўчая аповесьць жыцьця своеасаблівых „вадзяных" людзей на Вогненай Зямлі. Паказана як „культурныя эўропэйцы" зрабілі шчасьлівым першабытнага чалавека прывезьлі яго ў Лёндан, а там ён хутка апынуўся на вуліцы беспрацоўным. Для сярэдняга і старэйшага дзіцячага ўзросту.

Ванданаў. Рэўсамол Манголіі 2,5 арк. 9 малюнкаў. Кароткі нарыс пра нашу рэволюцыйную суседку Манголію і пра работу мангольскага рэволюцыйнага саюзу моладзі. Цікавая і карысная комсамольцам і школьнікам старэйшага ўзросту.

Безпалаў. Кітайскі камсамол 3 арк.

Даецца малюнак становішча Кітайскае моладзі і ўдзел яе ў рэволюцыі. Паказана Чырвоная Армія, камсамол савецкіх раёнаў, кітайская „Маладая Гвардыя", разьвіцьцё кітайскага КСМ ад V конгрэсу КІМ, асноўныя задачы кітайскага камсамолу і інш.

Гроссэ Ф. Рабочая моладзь у забастоўчым змаганьні. 2,5 арк.

Дае агульны агляд забастоўчага руху і, галоўным чынам, агляд удзелу ў ім рабочае ладзі. Прыстасавана для камсамолу.

Лёндон Джэк. Белы ікол. 10 арк.

Адзін з самых популярных і характэрных романаў Джэка Лёндана. У ім адлюстравана паўночная прырода і змаганьне з ёю чалавека. Разьлічана на сярэдні і старэйшы дзіцячы ўзрост. Чытаецца з захапленьнем.

Балеслаўская. Чорная Амэрыка. 6,5 арк. 24 малюнкі. Зборнік апавяданьняў амэрыканскіх пісьменьнікаў пра жыцьцё нэграў у ПАЗШ. Кніжка масавая. Разьлічана на старэйшы юнацкі ўзрост.

Назараў А. Як дзеці навучыліся кіраваць аўтамабілем. 5 арк. 29 мал.

У бэлетрыстычнай форме даецца знаёмства з пабудоваю аўтамабіля. Практычна паказваецца як ім карыстацца. Разьлічана на старэйшы і сярэдні дзіцячы ўзрост.

Семашка. Урыўкі ўспамінаў. 4 арк.

Падаюцца характэрныя і цікавыя рысы жыцьця рэволюцыянэраў ў пэрыод 1893-1917 году. Разьлічана на старэйшы юнацкі ўзрост.

Будзінаў С. За ўральскімі самацьветамі. 2 арк. 10 малюнкаў.

Зьмест: Усякія самацьветы ёсьць на Урале, але ці ёсьць дыямэнт? Гэолёгі кажуць няма, а мясцовы жыхар бярэцца знайсьці іх і давесьці, што дыямэнт на Урале ёсьць. Іх шукаюць. Разьлічана на старэйшы і сярэдні дзіцячы ўзрост.

Русанаў Е. За матор і дарогу. 1 арк. 8 малюнкаў.

Зборнік матэрыялаў для організацыі працы „юных прыхільнікаў аўтадору". Разьлічана на школы і ячэйкі аўтадору.

Міленьцьеў С. Жыцьцё і змаганьне 5 арк.

Паказваецца цікавы, складаны і цяжкі шлях вясковага хлапца: ад паслугача да партыйнага работніка. Паказаны архангельскія лясы, салдацкая служба, нямецкі палон, люксэмбурская турма, некалькі ўцёкаў і ўсюды—рэволюцыйная работа. Кніжка—аўтобіографія тав. Міленьцьева. Разьлічана на старэйшы і сярэдні дзіцячы ўзрост.

Крушынскі С. Аповесьць пра Турксіб. 5 арк. 25 малюнкаў.

Падрабязна апісана пабудова Турксібу Гэта рэч—адна з самых прыгожых аповесьцяў пра соцбудаўніцтва. Чытаецца з захапленьнем. Для старэйшага і сярэдняга дзіцячага ўзросту.

Штром Э. На небясьпечнай рабоце. 2 арк.

Нарысы з жыцьця камсамолу Фінляндыі. Разьлічана на камсамол і на старэйшы юнацкі ўзрост.

Якімовіч А. Перамога. 6 арк. з малюнкамі.

Адлюстроўвае колгаснае будаўніцтва і клясавае змаганьне на вёсцы. Твор прэміяваны на Ўсебеларускім конкурсе дзіцячае кнігі ў 1930 годзе. Для старэйшага і сярэдняга дзіцячага ўзросту.



Гольдэнбэрг. 35 мільёнаў. 1,5 арк. 17 малюнкаў.

Нарысы жыцьця ў капіталістычным сьвеце. Для малодшага і сярэдняга дзіцячага ўзросту.

Гальянаў і Янаў. Новыя задачы шэфства над флётам. 3 арк. 7 малюнкаў.

Вельмі актуальная ў сувязі з вайсковаю небясьпекаю. Напісана добра і зразумела.

Джон Гэнры. Рабочая моладзь у краіне даляраў. 3 арк. 8 малюнкаў.

Паказваецца эксплёатацыя рабочае клясы ў Амэрыцы. На агульным фоне эксплёатацыі адмыслова вылучаецца эксплёатацыя юнацкае працы. Вельмі цікавая, карысная для моладзі.

Забалоцкі М. Чырвоныя і сінія. 3/4 арк. 8 малюнкаў.

Цікавае апавяданьне, як хлопчык неўспадзеўкі трапіў у „бойку" на манэўрах, як апынуўся ў „палоне" і г. д. Для сярэдняга і малодшага дзіцячага ўзросту.

Уліцкі М. Консэрвы для кароў (сілос). 1 1/4 арк. 32 малюнкі.

У популярнай форме даецца апісаньне, як рабіць сілос і які ўдзел у гэтай справе могуць прыняць дзеці.

Віталін З. Зьлёт. (Піянэрскія вершы) 2 арк.

Краўцэвіч М. Міхаська. (Апавяданьні) 4 арк.

Напісана дынамічна, мастацкі добра аформлена, чытаецца з захапленьнем.

Лісты з волі. 3 арк.

Зборнік лістоў польскае камсамолкі з фашысцкае турмы. Паводле свайго зьместу гэтыя лісты—перажываньні, думкі і пачуцьці камсамолкі, якая асуджана фашысцкім судом на 10 год турмы. Кніжка дае яскравае ўяўленьне пра гэроізм польскіх рэволюцыянэраў у змаганьні за савецкую Польшчу.

Ляшэвіч. Урала-Кузьнецкі камбінат, 1 арк.

Нарыс напісан у лёгкай і цікавай форме. Карысны для азнаямленьня тых чытачоў, што ў свой час не сачылі за газэтамі.

Цігаў. Лямпачка ільліча. (Зборнік апавяданьняў) 3 арк.

Апавяданьні малююць жыцьцё дзяцей бедната за паншчынаю, у дарэволюцыйную пару пасьля Кастрычніка.

ЭКПРАЎСЭКТОР

Зборнік. Работу транспарту на вышэйшую ступень. 3 арк.

ВУЧПЭДСЭКТОР-

Програма па расійскай мове для польскай і яўрэйскай школы. 0,5 арк.

Рай М. Што можа і павінна зрабіць матка з толькі-што аглохшым дзіцянём? 1 1/4 арк.

Мэтодычны дапаможнік для культаармейцаў і матак.

Левін. Кніга-арыфмомэтр. 30 арк.

Кніжка Левіна можа замяніць дарагія замежныя выданьні і арыфмомэтры. Патрэбна інжынэрам і тэхнікам.

ХРОНІКА

ТРОХМЕСЯЧНІК РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЕ КНІГІ ДА 3-е БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЯСНЫ.

▲ **Менскі філіял** абгаварыў пытаньне правядзеньня веснавой сяўбы.

Агульны сход супрацоўнікоў дэталёва прапрацаваў задачы, якія стаяць у час правядзеньня гэтае кампаніі. Сход абвясьціў сябе ўдарным і мобілізаваным на час правядзеньня трохмесячніку. Колектыў супрацоўнікаў уключыўся ў ажыцьцяўленьне практычных мерапрыёмстваў, разгарнуўшы масавую працу з масава-політычнаю сельска-гаспадарчаю кнігаю.

Паводле пляну і вызначаных мерапрыемстваў кніга павінна быць пушчана непасрэдна ў колгасы, саўгасы і МТС. Мяркуецца правесьці брыгадныя выезды па сельсаветах, колгасах і саўгасах з агітпавозкаю. Пры Менскім філіяле створан агульны кнігагандлёвы штаб, які практычна павінен выканаць зацьверджаны плян.

Менскі філіял выклікае на соцспаборніцтва Гомельскі філіял на лепшае правядзеньне 3-е бальшавіцкае вясны і абмен практыкаю масавае працы з кнігаю.

▲ **Віцебскі філіял** ударна ўзяўся за правядзеньне 3-е бальшавіцкае веснавое сяўбы. Організован агульны кнігагандлёвы штаб, выпрацаван дэталёвы плян гэтае кампаніі, які зацьверджан Віцебскім Горпрофсаветам. Паводле пляну, масавая праца праводзіцца ў камсамольскіх організацыях, прадпрыемствах, шэфтаварыствах і г. д.

У правядзеньні гэтае кампаніі ўцягнута грамадзкасьць і адчуваецца значны зрух ў масавай працы з кнігаю па рэалізацыі практычных задач 3-е бальшавіцкае вясны.

▲ **Бабруйскі філіял** правёў агульны сход супрацоўнікаў. Сход зацьвердзіў плян працы і вызначыў асноўныя шляхі практычнае яго рэалізацыі. Ужываюцца мэтоды масавае працы праз промкаапэрацыю, спажыўкаапэрацыю і асабліва наладжана сувязь з вайсковымі часткамі. Штаб працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам Гарпрофсавету. Ёсьць конкрэтныя практычныя вынікі.

▲ **Гомельскі філіял** сур'ёзна ўзяўся за распаўсюджваньне с/г літаратуры да веснавое сяўбы. Праца ідзе шляхам сувязі з прадпрыемствамі, настаўніцтвам і школамі. Штаб трохмесячніку зацьвердзіў плян і ўзяўся за практычнае ажыцьцяўленьне. Колектыў супрацоўнікаў Гомельскага філіялу ўдарна ўзяўся за працу, за прасоўваньне кніг непасрэдна да колгасьніка, саўгасьніка і мас вага чытача. Самацёк, што быў у распаўсюджваньні масава-політычнае і с. г. кнігі зьмяніўся масаваю працаю.

▲ **Аршанскі, Полацкі і Мазырскі філіялы** паведамляюць, што на мяйсцох шырока разгорнута масавая праца праз сувязь з грамадзкімі організацыямі па распаўсюджваньню масава-політычнай і сельска гаспадарчай літаратуры. Філіялы рашуча запэўніваюць Сэктар Кнігагандлю, што кантрольныя лічбы будуць выкананы і перавыкананы не самацёкам, а шляхам сапраўднай большавіцкай масавай працы, шляхам правядзеньня растлумачальнай працы па давядзеньні кнігі да калгасьніка, саўгасьніка і аднаасобніка.

▲ **Магілёўскі філіял** паведамляе, што створан агульна-кнігагандлёвы штаб з удзелам партыйных, комсамольскіх і профсаюзных організацый. Наладжана добрая сувязь з мясцовым друкам, які будзе высьвятляць на старонках сваёй газэты політычнае значэньне правядзеньня трохмесячніка па распаўсюджваньню масава-політычнай і сельска-гаспадарчай кнігі. Зацьверджан плян трохмесячніку, грунтуючыся галоўным чынам на распаўсюджваньні кнігі праз масавую працу.

Ад рэдакцыі „ДЭКАДНІК".

Гандальфінплян за студзень і 20 дзён лютага філіяламі ня выканан. З ганебнымі прарывамі вышлі Бабруйскі, Магілёўскі, Віцебскі і Гомельскі філіялы.

Час, які застаўся да сканчэньня 1-га кварталу, павінен быць цалкам выкарыстаным на ліквідацыю прарыву.

Намечаныя шляхі масавай працы ў часе 3-й бальшавіцкай вясны па распаўсюджваньні масава-політычнай і сельска-гаспадарчай літаратуры неабходна штодзённа практычна ажыцьцяўляць філіяламі, што зьявіцца крыніцай для пасьпяховага выкананьня гандальфінпляну 1-га кварталу. Рэдакцыя „Дэкаднік" чакае ад філіялаў кожную пяцідзёнку лічбовыя весткі пра колькасьць рэалізаваных экз. і зьвесткі аб мэтадах масавай працы ў давядзеньні кнігі да кожнага колгаса, саўгаса і МТС.

Выдавец—Кнігасэктар ДВБ. Адказны Рэдактар Я. Клейнэр

Друк. імя Сталіна. Зак. № 386 1.500 экз. Уп. Галоўлітбел № А 108